# На тым тыдні...



✓У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага адкрылася вялікая **выстаўка «І славілі Айчыну меч і слова»**, прысвечаная вайне 1812 года. Самую цікавую і старажытную частку экспазіцыі склалі кнігі з калекцыі гродзенскага краязнаўцы і журналіста **Аляксандра Сявенкі**. Таксама тут прадстаўленыя прадметы матэрыяльнай культуры, што прысвячаюцца 200-годдзю гэтай падзеі, перыяду эпохі так званых Напалеонаўскіх войнаў. Экспанаты распавядаюць пра ўдзел і нашых продкаў.

Апроч гэтага, у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі адкрылася тэматычная выстаўка пра гэтую вайну.

✓**10 ліпеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася **выстаўка «Мой дружа, Янка»,** прысвечаная гісторыі сяброўства класікаў беларускай літаратуры – Янкі Купалы і Якуба Коласа, якое яны пранеслі праз усё жыццё. Тут прадстаўленыя першыя зборнікі вершаў паэтаў – «Жалейка» і «Песні жальбы», выданні нумароў газеты «Наша Ніва» з творамі беларускіх песняроў, вершы-прысвячэнні Якуба Коласа Янку Купалу, рукапісы ўспамінаў і артыкулаў Якуба Коласа, прысвечаных Янку Купалу.

✓**11 ліпеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася **выстаўка «Светлы паэтычны дар»**, прысвечаная юбілею беларускай паэткі, перакладчыцы, літаратуразнаўцы **Любові Турбіной**. Акрамя паэтычных зборнікаў, тут экспануюцца навуковыя выданні юбіляра, а таксама яе пераклады на рускую мову з беларускай, туркменскай, французскай. Працуючы ў Інстытуце літаратуры РАН, Л. Турбіна шырока папулярызуе беларускую літаратуру сярод рускіх аматараў прыгожага пісьменства.

✓**14 ліпеня** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей І з'езда РСДРП» адкрылася **выстаўка «Сад камянёў»,** дзе прадстаўленыя ўзоры мінералаў, горных парод, вырабы з каменю, выкапні, археалагічныя знаходкі і інш.

✓**13–14 ліпеня** ў польскім мястэчку Гарадок, што на Беласточчыне, прайшоў **фестываль «Басовішча-2012»**. Гэта найстарэйшы фестываль беларускай рок-музыкі, які ладзіцца з 1990 года. Адметнасцю ж сёлетняга з'яўлялецца тое, што акрамя рок-музыкаў, выступалі таксама выканаўцы этна-электронікі і нават рэперы.